# ПАМЯТНЫЯ СУСТРЭЧЫ

**80 год з дня нараджэння Петруся Броўкі**

**У. Е. ЛАБАНОК**

**Шчырае сяброўства звязвала народнага паэта Беларусі Петруся Броўку і савецкага дзяржаўнага і партыйнага дзеяча, аднаго з арганізатараў і кіраўнікоў камуністычнага падполля і партызанскага руху на Віцебшчыне ў гады Вялікай Айчыннай вайны Уладзіміра Елісеевіча Лабанка. Яны часта сустракаліся на пленумах ЦК КПБ і пасяджэннях Вярхоўнага Савета СССР, на розных урачыстасцях і ў час адпачынку. Прапануем увазе чытачоў успаміны Героя Савецкага Саюза У. Е. Лабанка, напісаныя ў 1984 г.**

Пятрусь Усцінавіч Броўка... Гэтае імя мне асабліва блізкае і дарагое. Маё першае знаёмства з ім — хай сабе і завочнае — адбылося яшчэ ў далёкія перадваенныя гады, калі я працаваў на Віцебшчыне дырэктарам Беліцкага, потым Смалянскага сельскагаспадарчых тэхнікумаў, а пазней першым сакратаром Лепельскага райкома партыі.

У тыя гады моладзь з незвычайным энтузіязмам імкнулася да ведаў, актыўна ўдзельнічала ў мастацкай самадзейнасці. Зразумела, што для рэпертуару перш за ўсё выбіраліся творы ўжо шырока вядомых аўтараў — Янкі Купалы, Якуба Коласа, Змітрака Бядулі, Кандрата Крапівы, Паўлюка



Труса... І вось паяўляецца новае імя — Пятрусь Броўка. Мы ўважліва сачылі за кожным яго крокам у літаратуры. Тым больш, што быў ён амаль што «наш», «свой» — з Ушаччыны. І паэт не ашукаў нашых спадзяванняў. Хутка мы пераканаліся, з якой шчырасцю і як праўдзіва пісаў ён пра людзей, пра іх унутраны свет, пра іх мужнасць. Адзін за другім вершы Броўкі трывала ўваходзілі ў наша жыццё, у нашу свядомасць. У іх мы як бы наноў убачылі хараство роднага краю, непадкупную шчырасць яго людзей, мары маладосці.

Мне давялося пазнаёміцца з яго радзімай — Ушаччынай. Ёй было суджана ў грозныя гады Вялікай Айчыннай вайны стаць цэнтрам Полацка-Лепельскай партызанскай зоны. Адразу палюбілася нам, партызанам, ціхая вёска Пуцілкавічы, абкружаная лясамі, уся ў зеляніне садоў. Незвычайна прыгожыя гэтыя мясціны, і людзі там прыветлівыя, працавітыя, шчырыя.

Думаецца, што ўсё гэта спрыяла лепшаму раскрыццю паэтычнага таленту Петруся Броўкі. Дзіцячыя, юнацкія ўражанні, яго бурная дзейнасць у маладыя гады шчодра жывілі музу бясспрэчна здольнага, надзеленага паэтычным дарам юнака. А ў час вайны яго талент неяк адразу акрэп і памужнеў. Творы Петруся Броўкі, як і іншых беларускіх паэтаў, занялі дастойнае месца ў адзіным баявым страі, яны бязлітасна каралі ненавіснага ворага.

У друкарні нашай зоны друкаваліся газеты шасці падпольных райкомаў партыі, многіх партызанскіх брыгад. Некаторыя з гэтых выданняў у мяне захоўваюцца і цяпер. З глыбокім хваляваннем бяру ў рукі газету Смаленскага партызанскага палка — «Народный мститель». У адным з нумароў быў апублікаваны верш Петруся Броўкі «Помста»:

Счарнелыя сады, атручаныя воды  
Завуць да помсты нас.  
Давайце псоў страляць!  
Сягоння кліч адзін: «Радзіма,  
я клянуся  
Адпомсціць за народ, за боль  
пякучых ран!»  
Азёры горкіх слёз, пакуты  
Беларусі  
Завуць да помсты нас,  
Ты чуеш, партызан?

Партызаны добра чулі гэтыя гнеўныя словы паэта, што клікалі на барацьбу з ворагам. Чулі — і яшчэ больш напаўняліся свяшчэннай любоўю да Радзімы і агністай нянавісцю да фашысцкіх рабаўнікоў.

Хвалююча, сурова, пераканаўча гучала слова Петруся Усцінавіча Броўкі ў тыя гады. Яшчэ ў першыя дні вайны ён даў сабе клятву ўсёй сілай свайго таленту змагацца супраць фашыстаў і быў верны гэтай клятве да апошніх залпаў, якія спавясцілі свету пра перамогу над фашысцкімі ордамі. Ён уславіў подзвіг савецкага салдата, дружбу сыноў і дачок братніх народаў, змацаваную крывёю на палях бітваў.

Я пазнаёміўся ў той час і з маці Петруся Усцінавіча — простай сціплай працаўніцай Аленай Сцяпанаўнай. Чым толькі магла, яна заўсёды дапамагала партызанам, дзялілася апошнім акрайцам хлеба, у яе сялянскай хаце заўсёды яны знаходзілі ўтульны куток. Не раз паведамляла нам, што робіцца ў суседніх нямецкіх гарнізонах, пра якія збірала звесткі, а ў выпадку небяспекі перасцерагала нас сама або праз сваячку Настассю Міхаль. І сустракала партызан заўсёды як дарагіх гасцей. Памятаю, як аднойчы пасля баявой аперацыі самым раннем вярталіся мы ў свой лагер праз Пуцілкавічы. Тут ужо ўсе ведалі, што мы спалілі некалькі нямецкіх аўтамашын, а гітлераўцаў, што ехалі ў іх, знішчылі. Сустрэла нас Алена Сцяпанаўна ў добрым настроі. Яе радаваў наш поспех.

А тут яшчэ неспадзяваная вестка, партызаны прачыталі ёй новы верш сына «Будзем сеяць, беларусы!»:

З поўным тэкстам дакумента можна азнаёміцца ў бібліятэцы